Created in Master PDF Editor - Demo Version


# Весці

## Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс. Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

№ 2 (40) 2004

Серыя 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія



*Галоўны рэдактар:*
**П. Дз. Кухарчык**

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
В. А. Бондар
(нам. галоўнага рэдактара)
В. В. Бушчык
Ю. А. Быкадораў
(нам. галоўнага рэдактара)
М. С. Вайтовіч
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
Т. А. Грыгор'ева
Л. М. Давыдзенка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
П. В. Кікель
Н. І. Копысава
(адказны сакратар)
Г. А. Космач
А. М. Люты
І. А. Новік
А. У. Рагуля
В. М. Русак
А. І. Смоляк
В. Дз. Старычонак
М. Т. Стэльмашук
В. Б. Таранчук
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. Г. Ясавееў
М. С. Яўневіч


## Змест

### Гісторыя

#### Да 60-годдзя вызвалення Беларусі


*Караткевіч А. Ц.* Навечна ў памяці народнай ... 3

*Каваленя А. А.* Аперацыя «Баграціён» ... 5

*Валчок Г. І.* Узаемадзеянне партызан Магілёўскай вобласці з часцямі Чырвонай арміі ў ходзе беларускай наступальнай аперацыі... 7

*Канапацкі І. Б., Шкуцько Л. П.* Садружнасць народаў СССР у перыяд вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў .... 10

*Кузьменка У. І.* Інтэлігенцыя ў антыфашысцкай арганізацыйнай і палітычнай рабоце ў перыяд вызвалення Беларусі ... 11

*Жылінскі М. Г.* Арганізацыя і праца савецкіх школ на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны... 15

✧ ✧ ✧

*Мацюш П. А.* Навуковыя і навукова-педагагічныя кадры гісторыкаў Беларусі: дынаміка колькаснага росту ў 60 — пачатку 70-х гг. XX ст. ... 21

*Пілецкі В. А.* «Гамераўскія» мужчынскія саюзы як адзін з элементаў фарміравання выхаваўча-адукацыйнага працэсу эпохі антычнасці ... 23

*Лапановіч С. Ф.* Дзейнасць Таццянінскага камітэта па аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны... 26

*Фядковіч Г. І.* Дзейнасць балгарскіх інтэрнацыяналістаў у Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайне ... 29

*Сямёнава С. А.* Роля купецтва ў развіцці гандлю, прамысловасці і фінансаў Беларусі ў другой палове XVIII — першай палове XIX ст...... 31

*Крывуць В. І.* Удзел Войска Польскага ў рэалізацыі ўрадавай маладзёжнай палітыкі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 30-х гг. XX ст. ... 35

*Важнік В. М.* Беларуска-польскае эканамічнае і гандлёвае супрацоўніцтва ў 50—70-х гг. XX ст. ... 38


### Філасофія


*Кікель П. В., Маркіянава Н. П.* Выхаванне як аснова станаўлення будучага спецыяліста ... 42

*Бліхарж Р. І.* Функцыі метадалагічных ведаў у навуковым даследаванні ... 45


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



*УДК [378:9](476)*

**П. А. Мацюш**

# НАВУКОВЫЯ І НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫЯ КАДРЫ ГІСТОРЫКАЎ БЕЛАРУСІ: ДЫНАМІКА КОЛЬКАСНАГА РОСТУ Ў 60 — ПАЧАТКУ 70-Х ГГ. XX СТ.

*Вывучэнне праблем вышэйшай школы* і яе кадравага патэнцыялу з'яўляецца аб'ектам і прадметам даследавання спецыялістаў розных дысцыплін: гістарычных, філасофскіх, сацыялагічных, паколькі заўсёды застаецца важнасць і актуальнасць пытанняў фарміравання навуковай інтэлігенцыі.

Вышэйшая школа — у пэўным сэнсе самастойная структура, валодаючая тымі навукова-педагагічнымі кадрамі, якія ажыццяўляюць даследчую працу і вызначаюць прагрэс у навуцы і адукацыі, з'яўляецца суб'ектам іх развіцця. І тым не менш знешні фактар, які выражаецца ва ўплыве дзяржавы на гэту частку сацыяльнай сферы, заўсёды прысутнічае. Асабліва ярка гэта выразілася ў савецкі перыяд, калі існавала адзіная мэтанакіраваная палітыка партыйна-дзяржаўных органаў улады ў сферы навукі і адукацыі і, такім чынам, і ў падрыхтоўцы адпаведных кадраў. Дадзеную палітыку можна выдзеліць у самастойную тэму даследавання і пачаць яго з агульных пастаноў органаў улады аб навукова-педагагічных кадрах, затым перайсці да вывучэння кадраў грамадазнаўцаў і ў выніку разгледзець, як гэта адлюстравалася на вышэйшай гістарычнай адукацыі і навуцы, а таксама яе спецыялістах.

У 60-х гг. XX ст. выйшлі два важнейшыя партыйныя дакументы, вызначыўшыя асноўныя кірункі ўдасканальвання работы з навукова-педагагічнымі кадрамі рэспублікі.

Прааналізаваўшы стан работы з кадрамі ВНУ, ЦК КП БССР і Савет Міністраў БССР 9 верасня 1961 г. прынялі пастанову «Аб мерах па паляпшэнні падрыхтоўкі навуковых і навукова-педагагічных кадраў у Беларускай ССР», а 7 жніўня 1962 г.— «Аб мерах па далейшым паляпшэнні падбору і падрыхтоўкі навуковых кадраў у Беларускай ССР». У пастановах разглядаліся пытанні рацыянальнага выкарыстання навуковага патэнцыялу рэспублікі. ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР патрабавалі палепшыць работу па адборы і прызначэнні на кіруючыя пасады маладых здольных навукоўцаў, стварыць ім усе ўмовы для плённай працы. У пастановах звярталася ўвага на ўдасканальванне планавання і каардынацыю навукова-даследчых работ, складанне штогадовых і перспектыўных планаў падрыхтоўкі аспірантаў. Асобнае месца адводзілася ўпарадкаванню падрыхтоўкі *маладых навуковых сіл па галінах навук і вызначэнні* аптымальных для рэспублікі маштабаў падрыхтоўкі кадраў праз аспірантуру.

Вынікам рэалізацыі гэтых пастаноў можна лічыць значны колькасны рост выкладчыкаў грамадскіх навук. Калі ў 1960/61 навучальным годзе было 37 кафедр грамадскіх навук, на якіх працавала 345 выкладчыкаў, то ў 1968 г.— 67 з колькасцю навуковых работнікаў звыш 700 [1, с. 121].

Рэалізацыя вышэйзгаданых пастаноў не магла не адбіцца на гістарычных кадрах вышэйшай школы. Прафесарска-выкладчыцкі калектыў гістарычных факультэтаў беларускіх ВНУ імкнуўся да таго, каб падняць на новы больш высокі ўзровень навуковую працу на факультэтах. Вялася плённая работа па павышэнні навуковай кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу.

Акрамя таго, пачынаючы з 60-х гг. у БССР праводзілася падрыхтоўка дактароў навук шляхам пераводу кандыдатаў навук і дацэнтаў ВНУ на пасады старшых навуковых супрацоўнікаў. У 1962 г. на іх было пераведзена 15 навукоўцаў, у тым ліку 3 спецыялісты-гісторыкі. З 1962 па 1987 г. такую магчымасць атрымалі 250 выкладчыкаў ВНУ.

Міністэрству вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі рэспублікі ўдалося за кароткі тэрмін стварыць механізм адбору асоб, якія прэтэндавалі на ступень доктара навук. Складвалася практыка, калі вядучае месца пры падборы кандыдатаў на гэтыя пасады адводзілася кафедры, факультэту [2, с. 39].

Такая практыка стымулявала дзейнасць прафесарска-выкладчыцкага саставу, рабіла актуальнай праблематыку навуковых даследаванняў. Пацвярджэннем таму з'яўляецца рост навуковых даследаванняў па гістарычных дысцыплінах у БССР, а таксама павелічэнне колькасці дактароў і кандыдатаў гістарычных навук (табл. 1).

*Табліца 1*

**Колькасць гісторыкаў у БССР (1960—1980 гг.)**

| Гісторыкі, акад. ступені | 1960 | 1970 | 1980 |
|---|---|---|---|
| Разам усіх гісторыкаў | 476 | 989 | 1082 |
| Дактароў навук | 6 | 32 | 50 |
| Кандыдатаў навук | 165 | 268 | 457 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



*Табліца 2*

**Колькасць дысертацый па гістарычных навуках у БССР (1961—1980 гг.)**

| Колькасць/тэмы дысертацый | 1961—1970 | 1970—1980 |
|---|---|---|
| Усяго | 209 | 346 |
| Гісторыя партыі | 95 | 162 |
| Гісторыя БССР/СССР | 68 | 104 |
| Усеагульная гісторыя | 13 | 34 |
| Археалогія, этнаграфія і іншыя дысцыпліны | 33 | 46 |

Усяго ў 1961—1970 гг. было абаронена 209 кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, у той час як у 1945—1960 гг.— 168, а ў перыяд з 1971 па 1980 г. адпаведна — 346 (табл. 2) [3, с. 379].

Такім чынам, 60-я гг. XX ст. можна назваць перыядам стабільнага колькаснага росту гістарычных кадраў, а таму і росту колькасці абароненых дысертацый па гістарычнай навуцы.

Характэрнай асаблівасцю 60-х гг. была наяўнасць разнастайных форм навучання на гістарычных факультэтах рэспублікі. Распаўсюджванне атрымала практыка падрыхтоўкі спецыялістаў па здвоеных спецыяльнасцях. Так, гістарычны і філалагічны факультэты Мінскага педінстытута былі рэарганізаваны ў гісторыка-філалагічны факультэт з пяцігадовым тэрмінам навучання. На новым факультэце пачалася падрыхтоўка настаўнікаў па спецыяльнасцях «Гісторыя. Руская мова і літаратура» і «Гісторыя. Беларуская мова і літаратура». У той час тут навучалася 911 студэнтаў, з іх 246 — на вячэрнім аддзяленні; працавала 6 кафедр, у тым ліку 4 літаратурна-моваазнаўчыя.

Аднак у хуткім часе падрыхтоўка настаўнікаў па ўказаным профілі была прызнана нематазгоднай. У 1957 г. на факультэце адкрылася навучанне па новай спецыяльнасці — «Гісторыя і геаграфія». Так пачаў развівацца гісторыка-геаграфічны факультэт з пяцігадовым тэрмінам навучання. І толькі ў лютым 1971 г. праводзіцца рэарганізацыя гісторыка-геаграфічнага факультэта, на базе якога былі створаны два самастойныя: гістарычны і прыродазнаўства. На гістарычным факультэце працягвалася падрыхтоўка настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства. Аднак у сувязі з патрэбай школ у спецыялістах шырокага профілю факультэт з восені 1971 г. пачаў рыхтаваць настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства з дадатковай спецыяльнасцю па адной замежнай мове [4, с. 47]. Павялічыўся састаў выкладчыкаў і студэнтаў. Калі ў 1955/56 навучальным годзе на стацыянары гістрычнага факультэта навучалася 255 студэнтаў, то ў 1972/73 навучальным годзе іх колькасць узрасла да 350. Акрамя таго, 750 чал. вучылася на завочным аддзяленні. Прафесарска-выкладчыцкі састаў павялічыўся нязначна: з 15 чал. у 1953 г. да 23 — у 1972 г. [5, с. 272].

У 60-я гг. падобная практыка ахапіла і гістарычны факультэт БДУ. У 1966 г. было адкрыта філалагічнае аддзяленне з дзённай, вячэрняй і завочнай формамі навучання, а ў 1970 г.— аддзяленне палітычнай эканоміі, якое ўваходзіла ў склад юрыдычнага факультэта [6, с. 169].

Такім чынам, можна сцвярджаць, што ў 60 — пачатку 70-х гг. назіраўся значны рост колькасці навукова-педагагічных кадраў спецыялістаў-гісторыкаў, хоць у агульнай структуры навуковай інтэлігенцыі колькасць дадзеных спецыялістаў узрасла нязначна, гэта значыць рост быў адносны. Гэты факт тлумачыўся рэалізацыяй пастаноў партыйна-дзяржаўных органаў улады, якія адводзілі першачарговае месца развіццю прыкладной навукі ў справе будаўніцтва грамадства развітога сацыялізму.

Перыяд 60 — пачатку 70-х гг. XX ст. можна назваць часам «кадравага выраўноўвання», паколькі быў пераадолены востры недахоп у кваліфікаваных спецыялістах, у тым ліку гістарычных, у пасляваенны час. Мяняліся арганізацыйныя і змястоўныя формы вучэбнага працэсу, што не заўсёды станоўча адбівалася на навукова-педагагічных і навуковых кадраў гісторыкаў рэспублікі.

ЛІТАРАТУРА

1. *Соколов Н. К.* Партийное руководство подготовкой и воспитанием кадров высшей школы БССР. Мн., 1978.
2. *Карзенка Г. У.* Аб падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў Беларусі ў 40—80-х гадах // Весці Акадэміі навук. Сер. гуманіт. навук. 1995. № 1.
3. *Ліндэр Райнэр.* Гісторыкі і ўлада. Нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX—XX стст. Мн., 2003.
4. *Тугай В. В.* Исторический факультет Белорусского государственного педагогического университета имени Максима Танка: прошлое и современность // Беларускі гістарычны часопіс. 2002. № 5.
5. Минский ордена Трудового Красного Знамени государственный педагогический университет имени А. М. Горького. Мн., 1971.
6. Белорусский ордена Трудового Красного Знамени государственный университет имени В. И. Ленина. Мн., 1971.

SUMMARY

*The article deals with the policy of the political and state authorities in the sphere of education and science, the preparation of the teacher's stuff for higher educational establishments. The article gives the figures of scientific pedagogical specialists and their growth.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version